# *§ 62–0. Рэспубліка Беларусь у свеце

**ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА**
**ШМАТВЕКТАРНАСЦЬ**
**САЮЗНАЯ ДЗЯРЖАВА САДРУЖНАСЦЬ НЕЗАЛЕЖНЫХ ДЗЯРЖАЎ**
**ЕЎРАЗІЙСКІ ЭКАНАМІЧНЫ САЮЗ**
**ШАНХАЙСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА БРІКС**

Асаблівасці геапалітычнага становішча Рэспублікі Беларусь

**1. Геапалітычнае становішча Беларусі.** Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь фарміруецца зыходзячы з яе геапалітычнага становішча. Яно вызначаецца тэрыторыяй дзяржавы і яе геаграфічным размяшчэннем.

Беларусь мяжуе з пяццю дзяржавамі. Ні з адной з іх наша краіна не мае тэрытарыяльных спрэчак. У сувязі з пашырэннем НАТА на ўсход і прыняццем новых членаў у Еўрапейскі саюз Беларусь пачала межаваць з гэтымі найбуйнейшымі аб’яднаннямі заходніх дзяржаў.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ




*1. З якімі дзяржавамі мяжуе Рэспубліка Беларусь? Якія з іх уваходзяць у склад ЕС і НАТА?*
*2. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якое месца займае Беларусь паводле плошчы тэрыторыі і колькасці насельніцтва сярод еўрапейскіх краін.*
*3. Ахарактарызуйце перавагі і недахопы геапалітычнага становішча Рэспублікі Беларусь.*

Важным элементам геапалітычнага становішча рэспублікі выступае тое, што цераз яе праходзяць зручныя транспартныя шляхі, якія злучаюць Расію і азіяцкія краіны з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы. Расія надае Беларусі адну з найважнейшых роляў у забеспячэнні сваёй бяспекі. Адпаведна, і Беларусь мае надзейны саюзны шчыт ад магчымых пагроз з боку краін НАТА, з якімі наша краіна непасрэдна мяжуе.

**2. Шматвектарны характар знешняй палітыкі.** Рэспубліка Беларусь — суверэнная еўрапейская дзяржава, якая праводзіць самастойную, міралюбную знешнюю палітыку, актыўна развівае супрацоўніцтва са стратэгічнымі саюзнікамі і замежнымі партнёрамі ў розных частках зямнога шара, кіруючыся нацыянальнымі інтарэсамі.

**Шматвектарнасць знешняй палітыкі**

Ад моманту здабыцця незалежнасці Беларусь пазіцыянавала сваю знешнюю палітыку як шматвектарную. Але пры гэтым значнасць розных знешнепалітычных вектараў для Беларусі неаднолькавая.

У знешняй палітыцы нашай краіны стратэгічнае значэнне маюць адносіны з Расіяй і Кітаем. Актыўна

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь**

Арт. 18

Рэспубліка Беларусь у сваёй знешняй палітыцы зыходзіць з прынцыпаў роўнасці дзяржаў, неўжывання сілы або пагрозы сілай, непарушнасці межаў, мірнага ўрэгулявання спрэчак, неўмяшання ва ўнутраныя справы і іншых агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў міжнароднага права.

Рэспубліка Беларусь выключае ваенную агрэсію са сваёй тэрыторыі ў дачыненні да іншых дзяржаў.

1. *Якімі прынцыпамі ў сваёй знешняй палітыцы кіруецца наша краіна? Растлумачце значэнне гэтых прынцыпаў.*
2. *Дакажыце, што Рэспубліка Беларусь праводзіць міралюбную знешнюю палітыку і імкнецца да актыўнага супрацоўніцтва з іншымі дзяржавамі.*

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

**Расійская Федэрацыя**

Галоўны эканамічны партнёр і ключавы ваенна-палітычны саюзнік

**Кітайская Народная Рэспубліка**

Беларусь і Кітай маюць агульную пазіцыю ў асноўных пытаннях міжнародных адносін і падтрымліваюць адно аднаго на сусветнай арэне. Актыўна развіваецца супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, гандлю

**РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ**

**Краіны Еўрапейскага саюза**

Напачатку XXI ст. ЕС займаў у гандлёвым абароце Беларусі другое месца пасля Расіі. Аднак уведзеныя напачатку 2020-х гг. краінамі ЕС санкцыі супраць Беларусі прывялі да зніжэння аб'ёмаў узаемнага гандлю

**Краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі**

Пасля ўведзеных Захадам санкцый Беларусь паспяхова замясціла долю гандлю з ЕС рынкамі Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Наладжванне эканамічнага супрацоўніцтва з «глабальным Поўднем» будзе працягвацца

**Аб'ём знешняга гандлю Рэспублікі Беларусь**




*«Беларуская дзяржава працягне праводзіць шматвектарную палітыку, і яна заключаецца не толькі ў выбудоўванні адносін з Усходам і Захадам. Мы прытрымліваемся гэтай шматвектарнасці з прычыны нашага эканамічнага становішча, нашай эканамічнай палітыкі… Вы памятаеце наш тэзіс: наша шматвектарнасць зыходзіць з эканамічных інтарэсаў. Мы экспартаарыентаваная краіна. Мы прадаём значна больш, чым спажываем з вырабленага. Таму эканоміка дыктуе нашу шматвектарнасць».*

*А. Р. Лукашэнка*

1. *У чым выяўляецца шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь? Якія задачы заклікана вырашаць шматвектарная знешняя палітыка?*
2. *Параўнайце аб'ёмы знешняга гандлю Рэспублікі Беларусь у 1995 і 2024 гг. Як змяніліся суадносіны экспарту і імпарту тавараў і паслуг?*
3. *Дакажыце, што шматвектарная знешняя палітыка станоўча ўплывае на эканамічнае развіццё краіны.*
4. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія эканамічныя ініцыятывы звязваюць Рэспубліку Беларусь і Кітайскую Народную Рэспубліку.*

развіваюцца адносіны з краінамі Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

**3. Удзел Беларусі ў інтэграцыйных працэсах.** Наша краіна выступае як актыўны ўдзельнік інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы.

**Садружнасць Незалежных Дзяржаў**

Рэспубліка Беларусь з'яўляецца адным з заснавальнікаў *Садружнасці Незалежных Дзяржаў*. Пагадненне аб стварэнні СНД было падпісана **8 снежня 1991 г.** кіраўнікамі трох саюзных рэспублік — Расіі, Украіны і Беларусі. 21 снежня 1991 г. Белавежскае пагадненне падтрымалі кіраўнікі яшчэ васьмі былых рэспублік СССР.

Эмблема СНД

Важным элементам эканамічнай інтэграцыі дзяржаў — удзельніц СНД з'яўляецца функцыянаванне зоны свабоднага гандлю з ёмістасцю рынку больш за 280 млн чалавек. Кіраўніцтва нашай краіны імкнецца дасягнуць максімальнай інтэграцыі паміж краінамі СНД перш за ўсё ў эканамічнай сферы, забяспечыць сацыяльныя гарантыі грамадзянам усіх дзяржаў Садружнасці на яе тэрыторыі.

**Саюзная дзяржава**

Рэспубліка Беларусь і Расійская Федэрацыя з'яўляюцца дзяржавамі — удзельніцамі Дамовы аб стварэнні *Саюзнай дзяржавы*, заключанай **8 снежня 1999 г.** Партнёрства Беларусі і Расіі будуецца на прынцыпах безумоўнага захавання дзяржаўнага суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці, адказнага выканання бакамі сваіх міжнародных абавязацельстваў, развіцця сумеснай дзейнасці і фарміравання агульнай прасторы ва ўсіх ключавых для развіцця дзяржаў сферах: эканамічнай, сацыяльнай, навукова-тэхнічнай, ваеннай і ваенна-тэхнічнай, культурнай, інфармацыйнай і інш.

**Арганізацыя Дамовы аб калектыўнай бяспецы**

Беларусь з'яўляецца членам *Арганізацыі Дамовы аб калектыўнай бяспецы (АДКБ)*, створанай у **2002 г.** Яна ўключае Беларусь, Расію, Арменію, Казахстан, Кыргызстан і Таджыкістан. Мэта арганізацыі — развіццё супрацоўніцтва ў знешнепалітычнай, ваеннай і ваенна-тэхнічнай галінах, каардынацыя

Эмблема АДКБ

і аб’яднанне намаганняў у барацьбе супраць міжнароднага тэрарызму і іншых сучасных пагроз бяспецы.

**Еўразійская эканамічная супольнасць**

У 1995 г. прэзідэнты Расіі, Беларусі і Казахстана падпісалі дамову аб стварэнні Мытнага саюза, да якога пазней далучыліся Кыргызстан і Таджыкістан. З апорай на гэты саюз у 2000 г. была створана *Еўразійская эканамічная супольнасць (ЕўрАзЭС)*. З 1 студзеня 2012 г. на тэрыторыі ЕўрАзЭС пачала дзейнічаць Адзіная эканамічная прастора, якая зрабілася важнай умовай стабільнага і эфектыўнага развіцця эканомік дзяржаў-удзельніц і павышэння ўзроўню жыцця насельніцтва.

**Еўразійскі эканамічны саюз**

У 2014 г. у сталіцы Казахстана Астане была падпісаная дамова аб стварэнні *Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС)*, які пачаў функцыянаваць з 1 студзеня 2015 г. Гэтая арганізацыя з’яўляецца інтэграцыйным аб’яднаннем, якое актыўна развіваецца. Для Беларусі з яе развітой прамысловасцю ЕўрАзЭС і ЕАЭС адкрылі шэраг рынкаў збыту многіх відаў прадукцыі. Беларускі бок выступае за пашырэнне знешняга гандлю дзяржаў — членаў ЕАЭС шляхам заключэння пагадненняў аб зонах свабоднага гандлю паміж ЕАЭС і трэцімі краінамі.

Эмблема ЕАЭС

**Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва**

З 2010 г. Рэспубліка Беларусь у статусе партнёра па дыялогу, а ад 2024 г. — у статусе паўнапраўнага члена ўдзельнічае ў *Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС)*. Гэтая арганізацыя была створана ў 2001 г. КНР, Расіяй, Казахстанам, Узбекістанам, Кыргызстанам і Таджыкістанам. Членства ў ёй стварае добрыя перспектывы для асваення нашай краінай важных рынкаў Азіі. Беларусь разглядае ШАС таксама ў якасці важнай міжнароднай пляцоўкі для развіцця супрацоўніцтва ў сферы процідзеяння пагрозам тэрарызму, экстрэмізму, арганізаванай злачыннасці і выступае за ўмацаванне эканамічнага супрацоўніцтва ў еўразійскім рэгіёне.

Эмблема ШАС

У лістападзе 2024 г. Рэспубліка Беларусь афіцыйна стала краінай — партнёрам БРІКС — міждзяржаўнага нефармальнага аб'яднання буйны́х краін, якія развіваюцца найбольш дынамічна, чые эканомікі маюць высокі патэнцыял для росту і якія выступаюць важнымі гульцамі на міжнароднай арэне. На долю БРІКС прыпадае каля траціны сусветнага ВУП і 45 % насельніцтва планеты.

**БРІКС**




*Эмблема БРІКС*

Асноўнымі мэтамі гэтага міждзяржаўнага аб'яднання з'яўляюцца развіццё эканамічнага супрацоўніцтва, умацаванне палітычных сувязей паміж краінамі-ўдзельніцамі і садзеянне рэформам у міжнародных фінансавых інстытутах. Статус партнёра ў БРІКС азначае, што краіна мае магчымасць удзельнічаць у розных мерапрыемствах арганізацыі, абменьвацца досведам і найлепшымі практыкамі, супрацоўнічаць з іншымі краінамі-ўдзельніцамі. Партнёрства дазваляе атрымаць доступ да рэсурсаў і тэхналогій, удзельнічаць у сумесных праектах, адкрывае дадатковыя магчымасці для гандлю і інвестыцый.

**Удзел у рабоце ААН**

**4. Дзейнасць Рэспублікі Беларусь у міжнародных арганізацыях.** Беларусь ад самага пачатку сваёй знешнепалітычнай дзейнасці пацвердзіла прыхільнасць да прынцыпаў Статута ААН і Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. У 1992 г. у Мінску адкрылася прадстаўніцтва ААН. Удзел у рабоце гэтай арганізацыі, сістэме яе органаў і спецыяльных устаноў дазваляе больш эфектыўна вырашаць задачы забеспячэння знешнепалітычнага развіцця беларускай дзяржавы. Дэлегацыя Рэспублікі Беларусь пастаянна ўдзельнічае ў сесіях Генеральнай Асамблеі, Эканамічнага і Сацыяльнага Савета ААН.

У рамках дзейнасці ААН Беларусь вялікую ўвагу надае пытанням раззбраення, барацьбы супраць тэрарызму. Наша краіна была ініцыятарам прыняцця Генеральнай Асамблеяй ААН рэзалюцыі

### ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Беларусь з'яўляецца членам шэрага спецыялізаваных устаноў ААН і міжурадавых арганізацый, якія ажыццяўляюць узаемадзеянне з ААН на падставе спецыяльных пагадненняў. Афіцыйныя дэлегацыі Рэспублікі Беларусь бяруць удзел у рабоце розных міжнародных форумаў, што праходзяць пад эгідай ААН.

*Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, з якімі арганізацыямі і ўстановамі сістэмы ААН супрацоўнічае Рэспубліка Беларусь. Прывядзіце прыклады такога супрацоўніцтва.*

аб стварэнні ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе зоны, свабоднай ад ядзернай зброі. Беларусь ініцыюе і падтрымлівае намаганні ААН, скіраваныя на забарону распрацоўкі новых відаў зброі масавага знішчэння. У 2005 г. на сусветным саміце ААН Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка вылучыў ініцыятыву аб актывізацыі міжнародных намаганняў у барацьбе супраць адной з найвастрэйшых праблем сучаснасці — гандлю людзьмі. У 2010 г. на аснове гэтай ініцыятывы Генеральная Асамблея ААН прыняла Глабальны план дзеянняў па барацьбе з гандлем людзьмі.

### Супрацоўніцтва з АБСЕ

У 1992 г. Рэспубліка Беларусь першая сярод краін СНД падпісала Заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, а таксама Парыжскую хартыю для новай Еўропы. Такім чынам, беларуская дзяржава зрабілася членам Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ). У 1999 г. беларуская дэлегацыя на чале з А. Р. Лукашэнкам узяла ўдзел у саміце АБСЕ ў Стамбуле. Кіраўнік дзяржавы падпісаў Хартыю еўрапейскай бяспекі. У 2003 г. Парламенцкая асамблея АБСЕ прызнала Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь у якасці паўнавартаснага беларускага парламента. Беларускія парламентарыі пачалі браць удзел у рабоце сесій Асамблеі на афіцыйным узроўні, што паспрыяла пашырэнню міжпарламенц-

кага дыялогу Беларусі ў рамках АБСЕ. Гэтая арганізацыя высока ацаніла намаганні нашай краіны ў мірным урэгуляванні ўкраінскага крызісу. Аднак пасля 2020 г. адносіны Рэспублікі Беларусь з АБСЕ пагоршыліся.

Абвастрэнне міжнародных адносін

**5. Спробы ўмяшання замежных дзяржаў ва ўнутраныя справы Рэспублікі Беларусь у 2020 г.** 2020 г. характарызуецца маштабным і глыбокім крызісам, выкліканым пандэміяй COVID-19, на якую розныя краіны адрэагавалі ўвядзеннем абмежаванняў практычна ва ўсіх сферах. Гэта прывяло да змянення звыклага ладу жыцця, наладжаных транспартных сувязей. Пандэмія каранавіруса абвастрыла міжнародныя адносіны, узмацніла дэзінтэграцыю ў ЕС. Беларусь, для якой характэрная адкрытая эканоміка, таксама адчула наступствы крызісу.

Прэзідэнцкія выбары 2020 г.

У 2020 г. у Рэспубліцы Беларусь адбылася найважнейшая палітычная кампанія — выбары Прэзідэнта. Выбарчая кампанія праходзіла ва ўмовах неаднаразовых спроб шэрага замежных дзяржаў і недзяржаўных арганізацый умяшацца ў ход выбараў і паўплываць на іх вынікі. У краіне адпрацоўвалася адна з формаў «каляровых рэвалюцый». Асабліва моцны ціск аказваўся ў інфармацыйнай прасторы (інтэрнэт-парталах, сацыяльных сетках).

Успомніце, што такое «каляровыя рэвалюцыі».

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка ацаніў падзеі жніўня 2020 г. як спробу мяцяжу з мэтай захопу канстытуцыйнай улады. Вынікі галасавання загадзя былі аб'яўленыя незаконнымі, каб яшчэ да абвяшчэння вынікаў выбараў справакаваць масавыя беспарадкі. Мэтай сутыкненняў з міліцыяй, мітынгаў і шэсцяў была спроба стварыць альтэрнатыўныя, г. зн. незаконныя і пазаканстытуцыйныя, органы ўлады, каб ад іх імя звярнуцца па дапамогу да ЗША і ЕС для правядзення новых выбараў ці прамога ваеннага ўмяшання. Аднак мяцеж поспеху не меў. Пратэстная дзейнасць паступова была

выцесненая за межы Рэспублікі Беларусь. У выніку краіны Захаду пачалі ажыццяўляць палітычны і эканамічны ціск на нашу краіну.

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2020 г. і іх наступствы атрымалі розныя ацэнкі ў міжнароднай супольнасці. З перамогай на выбарах А. Р. Лукашэнку павіншавалі старшыня КНР Сі Цзіньпін, Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі У. У. Пуцін, Прэзідэнт Рэспублікі Казахстан К.-Ж. Такаеў, Прэзідэнт Турцыі Р. Эрдаган і іншыя.

**Пагаршэнне адносін з краінамі Захаду**

Рэакцыя ЗША і краін ЕС праявілася ў прыняцці шэрага пакетаў эканамічных санкцый у дачыненні да некаторых фізічных і юрыдычных асоб Беларусі. На фоне надзвычай моцнага палітычнага і эканамічнага ціску ЕС і ЗША на Беларусь адносіны з імі трансфармаваліся з партнёрскіх і ўзаемавыгадных у жорсткае супрацьстаянне. У гэтых умовах Рэспубліка Беларусь узмацніла інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй у рамках Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы.

Разам з тым Рэспубліка Беларусь застаецца адкрытай для дыялогу з заходнімі краінамі з мэтай выхаду на пазітыўную траекторыю супрацоўніцтва, у першую чаргу ў гандлёва-эканамічнай і інвестыцыйнай сферах. Нягледзячы на выклікі апошніх гадоў, наша краіна ў сваёй знешняй палітыцы працягвае рэалізоўваць прынцып шматвектарнасці.

*Рэспубліка Беларусь праводзіць самастойную знешнюю палітыку. Актыўна развівае супрацоўніцтва з дзяржавамі ў розных частках зямнога шара, выступае адным з ініцыятараў і актыўным удзельнікам рэгіянальных інтэграцыйных структур і праектаў. Робіць істотны ўнёсак ва ўмацаванне міжнароднай бяспекі і стабільнасці насуперак недружалюбнай санкцыйнай палітыцы краін калектыўнага Захаду. У сваёй знешняй палітыцы Рэспубліка Беларусь рэалізуе прынцып шматвектарнасці.*

**калі ў свеце…**

2001 г. — стварэнне Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва

**на тэрыторыі Беларусі…**

2024 г. — Рэспубліка Беларусь зрабілася паўнапраўным членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Ахарактарызуйце геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь. Як геапалітычнае становішча ўплывае на знешнюю палітыку нашай краіны?
2. Дайце характарыстыку асноўным прынцыпам і кірункам знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе. Дакажыце, што знешняя палітыка Беларусі мае шматвектарны характар.
3. У склад якіх міждзяржаўных аб'яднанняў уваходзіць Рэспубліка Беларусь? Ацаніце ролю нашай краіны ў інтэграцыйных працэсах на постсавецкай прасторы.
4. Вылучыце асноўныя кірункі дзейнасці Рэспублікі Беларусь у міжнародных арганізацыях.
5. Якія прыкметы «каляровых рэвалюцый» праявіліся ў Беларусі ў 2020 г.? Якія фактары дазволілі нашай краіне паспяхова супрацьстаяць спробе «каляровай рэвалюцыі»?
6. Як змянілася знешняя палітыка нашай краіны пасля падзей 2020 г.?